Зрабіў перадаплату за будучыя нумары "Народнай волі" — змяшчай бясплатна прыватную рэкламу на нашым сайце www.nv-online.info
(Падрабязнасці на 8-й стар.)

№№77–78 (2805–2806)

28 мая 2008 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:

Народная Воля

Да ўвагі!
Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Шаноўныя чытачы!
Па пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 328-63-93, усе астатнія — па тэлефоне 328-68-71.

Заявление Президиума Политсовета ОДС

Белорусские власти провоцируют санкции в отношении Беларуси

Констатируя, что в настоящее время отношения Беларуси с США и Европейским Союзом переживают очередной кризис;

принимая во внимание, что непродуманные действия Лукашенко по выдавливанию посольства США из Беларуси создают реальную угрозу введения экономических и политических санкций в отношении страны;

напоминая, что белорусские власти неоднократно инициировали международные скандалы и обострение отношений как с отдельными странами, так и с международными организациями;

сожалея, что внешняя политика белорусского режима ориентирована не на защиту национальных интересов Беларуси и миллионов ее граждан, а на удовлетворение политических амбиций одного человека;

исходя из интересов подавляющего большинства граждан Беларуси, заинтересованных в развитии устойчивых, дружественных отношений Беларуси со всеми цивилизованными странами,

Президиум Политсовета ОДС

решительно осуждает политику конфронтации, которую проводят белорусские власти во взаимоотношениях с США и Европейским Союзом;

возлагает ответственность за возникшие у белорусских граждан проблемы с получением виз в США, за свертывание программ гуманитарного сотрудничества и угрозу введения экономических санкций в отношении Беларуси на Лукашенко и его ближайшее окружение;

заявляет о своей готовности содействовать урегулированию отношений Беларуси с США и Европейским Союзом и созданию условий для взаимовыгодного экономического, гуманитарного и политического сотрудничества. Это возможно только при выполнении властями Беларуси ряда условий, первое из которых — незамедлительное освобождение всех политзаключенных.

Стаўрапольскі край узначаліў наш зямляк

Валерый Гаеўскі ўзначаліў Стаўрапольскі край Расіі.

Валеры Гаеўскі нарадзіўся ў 1958 годзе ў Гомельскай вобласці, у горадзе Петрыкаве. За яго плячыма Маскоўскі геолагаразведачны інстытут і Стаўрапольскі дзяржаўны універсітэт, работа ва ўрадзе названага краю і Міністэрстве рэгіянальнага развіцця Расійскай Федэрацыі.

Кандыдат эканамічных навук, кавалер ордэна Пашаны.

На Краснаполлі ствараюць суперкалгас

Усе сельскагаспадарчыя прадпрыемствы Краснапольскага раёна Магілёўскай вобласці аб'ядноўваюцца ў адно дзяржаўнае сельгаспрадпрыемства.

Старшыня райвыканкама Аляксандр Вятошкін заявіў, што рэарганізацыя дазволіць узняць эфектыўнасць раённай гаспадаркі. Тым часам незалежныя эксперты не вераць у плён такой рэарганізацыі.

КАМЕРТОН

от Сергея Ваганова

Палец императора

Бывший президентский идеолог Пролесковский написал, а газета "7 дней" напечатала сочинение, названию которого позавидовал бы сам Монтень: "Некоторые размышления о человеческих ценностях".

Размышления, надо понимать, не все. Что-то, наверно, Александр Козулин услышит еще, пока сидит в тюрьме и продолжает, по Пролесковскому, делать пиар на смерти жены... "Самый распиаренный белорусский заключенный" — таким представляет Козулина Пролесковский.

Ну, не самый, осталось еще распять...

Воздержимся от эмоций, хотя это нелегко. По-своему правы те из многочисленных комментаторов в интернете, распространившем данное сочинение, которые призывают предоставить автору возможность самому разгребать навороченную словесную кучу.

Все так. Если бы господин Пролесковский не причислил себя к "представителям власти" и не призвал на помощь мораль с ее авторитетами — от Василя Быкова, который якобы "попросил не делать из его похорон политическую акцию", до отважных морпехов, у которых "с ценностями все в порядке". А между ними — президент, который (как смело!) "абсолютно прав", и доктор Вайс, немецкий посол, у которого "не укладывается в голове"...

В общем, когда не хватает аргументов и доказательств, в ход идет морализаторство. Ну не получается сделать из бывшего кандидата в президенты "обыкновенного уголовника". Так давайте сделаем из него аморального человека, для которого "нет ничего святого"...

Многие считают, что пером "представителя власти" водил некий расчет. Дважды понижен-де в должности, вот и жаждет сам "распиариться", напомнить о своей преданности хозяину, взять на себя "не царское дело" доказывать, что комья грязи, брошенные правителем в Козулина, — высококачественный продукт...

Нет, самое страшное — не расчет, а искренность, с какой совершается издевательство над человеческим горем. Святотатство, по сути, в обертке из "некоторых размышлений" о святости...

"Любой нормальный человек, — "размышляет" Пролесковский, — с нормальными человеческими ценностями ради последних минут, часов, дней рядом с родным, любимым человеком согласился бы на все..."

"На все", напомню, — это на унизительную высылку из страны, безнравственную сделку с властью, которая, конечно же, живет и действует в полной гармонии с "нормальными человеческими ценностями"...

Хотел того Пролесковский или не хотел, но его сочинение абсолютно глухо к этим ценностям и являет собой еще одно порождение и подтверждение безнравственности, с какой некоторые "представители власти" пестуют собственную мораль.

Это, безусловно, корпоративная мораль. Недаром Пролесковский взывает к "остальным представителям власти", к "остальным чиновникам", рекламируя свой явно сомнительный успех в судебной тяжбе с "Народной волей"... И выводит политику за рамки общечеловеческой морали. "Я считаю, — пишет он, — что истинные человеческие ценности первичны. Все остальное, в том числе политика, далеко позади..."

Случилось мне однажды услышать от одного политика, как тяжко и тошно ему жить с этим "поганым занятием". Пришлось напомнить ему, что поганым любое занятие делают поганые люди.

...Жить или не жить поверженному гладиатору в Древнем Риме решалось с помощью большого пальца. Поднятый вверх — значит жить. Опущенный вниз — "Pollice verso!", что означало "Добей его!".

Еще не остывший от кровавого зрелища римский плебс внимательно следил за пальцем императора.

Историки свидетельствуют, что чаще всего этот палец указывал вниз.

Для Пролесковского, похоже, палец императора важнее тех человеческих ценностей, о чистоте которых он так печется.

kamerton_41@mail.ru

ГРОМКОЕ ДЕЛО

Евгения Шигалова переводят в кардиологический центр

Эту новость "Народной воле" сообщили родственники председателя совета директоров Торгового центра "Ждановичи" Евгения Шигалова.

Как уже сообщала "Народная воля", 7 мая Евгений Александрович попал в Республиканскую тюремную больницу с подозрением на инфаркт.

"Диагноз "инфаркт" точно подтвердился, — сказали "Народной воле" родственники Шигалова. — *Нам сообщили, что его вот-вот должны перевести на обследование в кардиологический центр. Что это будет за центр — РНПЦ "Кардиология" или какой-то другой — нам не известно. Нам вообще очень сложно получать какую-то информацию. Мы просили, чтобы это был специализированный кардиоцентр, с хорошими специалистами, современным оборудованием. Мы долго добивались этого перевода, но только 27 мая появилась информация о том, что наконец-то принято решение о переводе Шигалова на дальнейшее обследование — это ведь его третий инфаркт".*

Судя по всему, в кардиологическом центре Евгений Александрович будет находиться под стражей. По словам родственников, *"меру пресечения ему никто не изменял".*

"Мы просим, чтобы его освободили под залог, под домашний арест, под поручительство, под что угодно — есть много различных мер, лишь бы он не находился под стражей, — говорят родственники. — *Почему его держат за решеткой — это большой вопрос".*

Родственники бизнесмена утверждают, что он не стал бы скрываться от следствия и не пытался бы получить убежище в другой стране. По их словам, Шигалов знал, что правоохранительные органы начали допрашивать его сотрудников. И если бы ему было что скрывать, он скрылся бы уже давным-давно.

С тех пор, как Шигалов находится в Республиканской тюремной больнице, супруга виделась с ним лишь один раз.

"Ровно две недели назад ей позволили увидеть его — дали короткое свидание, — говорят родственники известного бизнесмена. — *Тогда Евгений Александрович был в тяжелом состоянии. Он даже два часа на свидании не смог высидеть".*

Напомним, что в отношении Е.Шигалова возбуждено уголовное дело по подозрению в совершении злоупотреблений служебным положением должностными лицами, повлекшими причинение тяжких последствий в виде ущерба экологической среде.

Шигалов не признает свою вину.

Марина КОКТЫШ.

ИЗ АРХИВА

"Не исключено, что в реанимации Шигалов оказался потому, что перестал принимать прописанный препарат..."

— Еще до инфаркта Шигалов перенес сложнейшую операцию на спине, — рассказали "Белгазете" родственники Шигалова. — Работая автослесарем, он получил несколько грыж позвоночника. В конце 1990-х гг. пытался лечиться в минских клиниках, обращался к мануальному терапевту, однако результат был плачевным: Шигалов практически не мог ходить. Поэтому приняли решение оперироваться в одной из клиник Лондона. Операция прошла успешно. Вернувшись в Минск, Шигалов занялся любительской игрой в большой теннис. Со временем в деревне Тарасово появился физкультурно-оздоровительный центр, относящийся к ТД "Ждановичи", с двумя теннисными кортами.

Во время игры в теннис в 2001 году у Шигалова и случился инфаркт. Откачивали его на протяжении пяти часов, за это время он перенес две или три клинические смерти. Состояние было настолько тяжелым, что врачи не рискнули везти его в реанимацию. Медпомощь поочередно оказывали врачи трех бригад "скорой помощи": запас медпрепаратов, которые вводили Шигалову, был ограничен. Как только лекарство заканчивалось, вызывали новую "скорую".

После стабилизации состояния Шигалова перевезли в реанимацию лечкомиссии, а затем в отделение кардиологии. После этого случая было назначено обследование в одной из клиник Лондона. Ее специалисты сообщили о необходимости немедленной операции: проходимость аорты сердца не превышала 10%. В 2001 году Шигалову провели операцию аортокоронарного шунтирования. Выписали его на третий день после операции, а вскоре разрешили вернуться домой.

По распоряжению докторов Шигалов ежедневно принимал лекарства, которые выписывали на ежегодном медобследовании. Получить препараты без обследования невозможно. Очередное обследование назначено на конец 2008 года.

Не известно, продолжал ли в СИЗО Шигалов прием лекарств. Лекарство, выписанное лондонскими врачами, не сертифицировано в нашей стране. Узнав об этом, тюремные врачи сообщили, что не могут разрешить его употребление. С горем пополам удалось передать лекарство, однако попало ли оно к Шигалову, не известно. Не исключено, что в реанимации он оказался потому, что перестал принимать прописанный препарат..."

Кардиохирурга Александра Шкета осудили, но оставили на свободе

27 мая суд Московского района Минска поставил точку в одном из самых громких дел, связанных с белорусскими медиками.

Сегодня в Беларуси никого не удивишь сообщением о том, что какого-либо врача судят за получение взятки. Но когда на скамье подсудимых оказался кардиохирург, один из немногих в Беларуси, кто выполняет практически все операции на сердце, дело получило широкий резонанс. В защиту Александра Шкета встали пациенты и коллеги. Они писали письма в суд, в Администрацию президента и даже лично Александру Лукашенко. И пациенты, и врачи были уверены: Шкет не совершал тех преступлений, которые ему вменялись.

А обвинения в отношении Шкета были очень серьезные. В деле фигурировали несколько статей Уголовного кодекса: мошенничество, неоказание помощи больным, злоупотребление служебным положением, взяточничество. Судебные слушания длились четыре с половиной месяца. Пока шли судебные заседания, Александр Шкет не переставал оперировать. Даже на оглашение приговора кардиохирург приехал в суд после того, как провел за операционным столом 5 часов.

Бывшие пациенты доктора, которые присутствовали практически на всех заседаниях, утверждали, что в ходе судебного следствия так и не услышали и не увидели очевидных доказательств вины доктора. И когда прокурор попросила осудить Александра Шкета на 7 лет лишения свободы, все ахнули.

В своем последнем слове суду Александр Шкет заявил, что квалифицирует свое обвинение как оговор. *"Меня судят за то, что я оказал помощь пациентам, работая в сложных условиях, и преодолел эти трудности. Я могу сказать с полной ответственностью и откровенностью, что отдавал пациентам все свои силы и знания".*

Почти две недели потребовалось суду для вынесения приговора по делу, которое заняло более 50 томов. 27 мая судья Тамара Внукевич вынесла приговор: Александра Шкета осудить на 3 года ограничения свободы без направления в исправительное учреждение открытого типа, без конфискации имущества и без лишения права занимать должности, связанные с выполнением организационно-распределительной функции. Проще говоря, Шкета осудили, но не посадили.

Бывший заместитель СП "Мультимедицин" Игорь Васюкевич, который также проходил по этому делу, был осужден на 2 года и 6 месяцев лишения свободы. Но поскольку он уже отбывал наказание по аналогичному обвинению (дело кардиохирургов 2005 года), то в итоге срок наказания был "погашен". Единственное наказание - суд обязал Васюкевича возместить в пользу медпредприятия более 3 миллионов белорусских рублей.

Александр Шкет после вынесения приговора выглядел очень уставшим и подавленным. От каких-либо комментариев он отказывался. "Надо успокоиться, обдумать все, а потом давать комментарии", — сказал Александр Павлович. Адвокат кардиохирурга Ирина Багнич заявила, что приговором удовлетворена. *"С учетом позиции государственного обвинения, которое потребовало для моего подзащитного 7 лет лишения свободы,* — сказала Ирина Ивановна, — *я расцениваю приговор как победу. Но не могу сказать, что до конца довольна вынесенным приговором. И думаю, что мой подзащитный тем более не удовлетворен таким вердиктом".*

...После вынесения приговора, который был зачитан в 18 часов, Александр Шкет поехал не домой, а в клинику.

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

ДЫПКУР'ЕР

Да пабачэння, Любамір Рэгак!

Кіраўнік дыпламатычнай місіі Славакіі ў Беларусі Любамір Рэгак — чалавек надзвычай добразычлівы. Пра гэта літаральна ў адзін голас кажуць усе, каму давялося сутыкацца з ім за тыя два гады, што ён працаваў у Мінску. І вось, з'язджаючы з Беларусі, спадар Любамір яшчэ раз замацаваў у вачах сваіх знаёмых гэту якасць.

На развітанне ён сфатаграфаваўся паасобку з кожным з гасцей, якія прыйшлі, каб сказаць яму "Да пабачэння". Не памятаю яшчэ аднаго такога дыпламата, які б знайшоў магчымасць захаваць на памяць пра працу ў Беларусі столькі фотаздымкаў. І хаця ў зале Беларускага таварыства культурных сувязяў з замежжам, дзе праходзіў прыём, утварылася доўгая чарга, ніхто не наракаў на гэта.

Калі два гады таму Любамір Рэгак пачаў працаваць у Беларусі, многія думалі, што ж гэта за чалавек і як ён будзе сябе паводзіць. А спадару Любаміру было чаго асцерагацца — ягоны папярэднік Йозаф Мачышак быў вельмі сімпатычным чалавекам, які пасябраваў з многімі беларусамі. І здавалася, што перакрыць такі ўзровень добразычлівасці немагчыма.

Але высветлілася, што магчыма. Любамір, які ў свой час вучыўся ў Маскве і цудоўна ведае рускую мову, цалкам мог абысціся гэтымі ведамі і ў Мінску. Але ён цвёрда вырашыў навучыцца гаварыць па-беларуску. І надзвычай хутка зрабіў гэта. І гэта сур'ёзны папрок у адрас тых чыноўнікаў, ды і наогул грамадзянам Беларусі, якія беларускую мову лічаць занадта складанай.

Славацкі дыпламат першым адгукнуўся на сакавіцкую ініцыятыву — напісаць дыктоўку па-беларуску. І, нягледзячы на тое, што ён вельмі мала пражыў у Беларусі, з заданнем справіўся проста цудоўна. Яго асабісты прыклад падштурхнуў далучыцца да напісання дыктоўкі дыпламатаў з іншых краін, якія сумняваліся, ці патрэбна гэта рабіць. Патрэбна!

Сустаршыня Аб'яднанных дэмакратычных сіл у Беларусі Анатоль Лябедзька, калі даведаўся пра тое, што Любамір Рэгак з'язджае з Мінска, вельмі шкадаваў. Ён казаў, што спадар Любамір, як ніхто з іншых дыпламатаў, якія працуюць у Беларусі, разумеў тое, што адбываецца ў нашай краіне. Магчыма, таму, што ён славак. А гэта краіна на пачатку сваёй незалежнасці і падзялення Чэхаславакіі на Чэхію і Славакію таксама зведала, што такое дыктатура. Славацкі прэзідэнт — паэт Уладзімір Млечар, апынуўшыся на самых вярхах улады, пачаў паводзіць сябе як дыктатар. Іншая справа, што насельніцтва Славакіі даволі хутка раскусіла ягоны аўтарытарызм і здолела змяніць кіраўніцтва краіны.

Так атрымалася, што Славакія два тэрміны запар прадстаўляла ў Беларусі інтарэсы Еўрапейскага Саюза. І цягам двух тэрмінаў ад імя гэтай міжнароднай арганізацыі менавіта спадару Рэгаку даводзілася быць на розных судах, пісаць шматлікія заявы, прэс-рэлізы. Ён спачуваў беларусам, якія змагаюцца за дэмакратыю, і гэта ўсе пабачылі на развітальным банкеце, калі сярод звычайных наведвальнікаў такіх мерапрыемстваў была маці палітвязня Андрэя Кіма, а таксама Галіна Сіўчык са сваімі сынамі, былы палітвязень Сяргей Скрабец, шматлікія прадстаўнікі апазіцыйных палітычных партый.

Афіцыйны Мінск на гэтым мерапрыемстве прадстаўляў намеснік міністра замежных спраў Валерый Варанецкі, але да мікрафона ён так і не падышоў. І я думаю вось чаму: такія дыпламаты, як Любамір Рэгак, не падабаюцца беларускаму кіраўніцтву. Гэта пра іх Аляксандр Лукашэнка неаднаразова казаў, што лезуць не ў свае справы, плятуць нейкія інтрыгі. І мне падаецца, што Валерый Варанецкі не прыйшоў бы на развітанне з Любамірам Рэгакам, калі б не адна акалічнасць. Спадар Варанецкі, перад тым як стаць намеснікам міністра, працаваў амбасадарам Беларусі якраз у Славакіі. Ён прабыў у Браціславе гадоў пяць, і дзеля аб'ектыўнасці трэба адзначыць, што зрабіў таксама нямала, каб эканамічныя стасункі паміж Беларуссю і Славакіяй паляпшаліся і развіваліся. І менавіта таму ён, мабыць, не меў права не прыйсці, каб сказаць былому калегу "Да пабачэння!".

У Мінску, іншых месцах Беларусі ў Любаміра Рэгака засталіся сапраўдныя сябры. Гэта людзі, якія перажываюць за Беларусь. Сярод іх мастак Алесь Пушкін. Менавіта да яго ў мястэчка Бобр, што ў Крупскім раёне, паехаў напярэдадні развітання Любамір Рэгак. Ён паглядзеў царкву, якую распісаў гэты самабытны мастак, агледзеў выставу драўляных фігур, зробленых Алесем і, магчыма, адведаў моцны беларускі напой, які гоняць у гэтых мясцінах і які мае надзвычай высокую рэпутацыю сярод знаўцаў спіртных напояў.

Хто заменіць Любаміра Рэгака ў Беларусі і ці будзе працягнута традыцыя надзвычайнай добразычлівасці славакаў да нашай краіны? Вядома, што гэтым чалавекам будзе прафесійны дыпламат. Раней ён працаваў у Польшчы, Ватыкане. А што тычыцца самога Любаміра Рэгака, дык ён, паводле неафіцыйнай інфармацыі, будзе пасля Мінска працаваць у Бруселі ў структурах Еўрапейскага Саюза.

Поспехаў Вам, здароўя, спадар Рэгак!

Уладзімір ГЛОД.

ПАЛІТКУХНЯ

Канстытуцыйнаму суду шукаюць работу

Канстытуцыйны суд Беларусі неабходна надзяліць дадатковымі паўнамоцтвамі, каб максімальна эфектыўна задзейнічаць яго патэнцыял. Да такой высновы прыйшлі ўдзельнікі нарады ў Аляксандра Лукашэнкі.

Падчас абмеркавання прагучалі розныя пункты гледжання наконт мэтазгоднасці пашырэння паўнамоцтваў КС. Прапаноўвалася актывізаваць удзел Канстытуцыйнага суда ў нарматворчай дзейнасці, асабліва на стадыі распрацоўкі законапраектаў, праверцы іх канстытуцыйнасці да падпісання кіраўніком дзяржавы. Канстытуцыйны суд таксама выступіў з ініцыятывай праверкі па прапанове Савета рэспублікі фактаў сістэматычнага або грубага парушэння мясцовымі Саветамі дэпутатаў патрабаванняў заканадаўства.

У той жа час прапанова надаць Канстытуцыйнаму суду паўнамоцтвы па разглядзе спраў, ініцыяваных звычайнымі грамадзянамі, нават не абмяркоўвалася.

Аляксандр Лукашэнка даручыў падрыхтаваць і ў чэрвені прадставіць яму на разгляд нарматыўна-прававы акт, у якім будзе адлюстравана пашырэнне паўнамоцтваў і сфер дзейнасці Канстытуцыйнага суда.

Іх аб'яднала гора і раўнадушша чыноўнікаў

Каля паўсотні жанчын з незарэгістраванага аб'яднання ў абарону грамадзянскіх правоў заявілі пра неабходнасць стварэння грамадскай камісіі дзеля перагляду крымінальных спраў.

"Стаўленне да Генеральнай пракуратуры ў нас асабліваe, — кажа юрыст Тамара СЯРГЕЙ. — Таму што, згодна з нашай Канстытуцыяй, народ даверыў Генпракуратуры адказваць за дакладнае выкананне закона ў нашай краіне. І народ мае права даць ацэнку яе рабоце і спытаць: "Як вы выконваеце нашы даручэнні?" Жанчын, якія прыехалі ў Мінск з усіх рэгіёнаў краіны, аб'яднала адно гора — яны гадамі дабіваюцца ад прадстаўнікоў пракуратуры рэагавання на свае скаргі, але атрымліваюць фармальныя адпіскі пад капірку".

Людзі расказвалі пра свае паходы "па калідорах улады" і пра тое, што іх там ніхто не чуе.

"Пяць гадоў хаджу па розных інстанцыях, — расказвае спадарыня Богуш. - Ніхто нідзе не чуе, адны адпіскі..."

Жанчыны паведамілі, што не так даўно быў накіраваны ліст новаму генеральнаму пракурору Беларусі Рыгору Васілевічу, у якім яны просяць прызначыць сустрэчу.

"Калі нас і на гэты раз не пачуюць, то будзем звяртацца ў міжнародныя інстанцыі", — рашуча дадалі яны.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

СКАЗАНО!

Игорь РАЧКОВСКИЙ, председатель Государственного пограничного комитета:

«Средства массовой информации должны поднимать проблемы...»

"Я ни в коем разе не хлопаю в ладоши и не говорю, как у нас в Беларуси все хорошо, — *сказал генерал-майор Игорь Рачковский на одной из недавних пресс-конференций.* — Конечно, у нас есть проблемы. И их надо поднимать. И к этому надо относиться нормально. Вот я — подчеркиваю — отношусь нормально к критическим статьям, которые появляются в прессе. Правильно, а кто еще напишет? Для этого ведь и существуют средства массовой информации — четвертая власть. Они должны поднимать проблемы...".

Думается, многие белорусские чиновники в этом смысле должны брать пример с председателя Государственного пограничного комитета. Настоящий руководитель должен не в суд бежать, прочитав критику в свой адрес (или в адрес своего ведомства), а выводы делать и "спасибо" говорить за то, что помогли увидеть проблему...

НЕЗЛОБИВЫЕ ЗАМЕТКИ

Семен БУКЧИН

О национальной истории и «шкурном вопросе»

Посвящаю студентам-историкам и студентам-журналистам

I

"Сверху" запланировано исключить "Историю Беларуси" из школьных программ как отдельный предмет. Как принято в авторитарных государствах, никто никого не спрашивал, ни власть народ, ни народ власть, — нужно или не нужно это делать, включать ли историю родной страны в некую "Всемирную историю" или оставить в виде отдельного курса. Общественной дискуссии по крупнейшей национальной проблеме не намечается.

Более того. Полагаю, что в условиях этой тиши и благодати идея может получить дальнейшее развитие. Скажем, почему бы, имея в виду создание Союзного государства (этот долгоиграющий проект еще послужит предметом политических спекуляций с разных сторон), не включить "Историю Беларуси" в "Историю Государства Российского"? И чтобы уж пойти, что называется, до самого конца, то и название соответствующего раздела поменять. Не "История Беларуси", а "История Северо-Западного края". Или уж совсем современно — "История Северо-Западного региона". Это с учетом того, что современная Россия делится на регионы, которые в последнее время, как известно, укрупняются.

"Ну ты загнул! — скажет мне читатель. — Кто ж на такое пойдет? У нас же есть президент, гарант белорусской суверенности-независимости!"

Вот и я думаю: гарант есть, а "Истории Беларуси" в школах не будет. То есть не будет отдельного курса истории белорусского государства. Нет, что-то на эту тему учителя рассказывать будут, но как-то вплетая Полоцкое княжество между походами Ганнибала и наполеоновскими войнами. Такая вот историческая "сборная солянка". Подавали когда-то блюдо с таким названием в ресторанах. Супчик, надо сказать, был неплохой. Насчет же качества "духовного блюда" сильно сомневаюсь...

Но давайте смотреть в корень. Кому это в самом деле нужно? Говорят, мера вынужденная, переходим на 11-летнее образование, нужно сокращать, ужимать программы, урезать, унифицировать школьные предметные курсы и т.д. А вот интересно мне: как будет с геометрией? Урежут ли парочку параллелепипедов и прочих многоугольников или оставят их в полном наборе?

"Ну что ты несешь? — скажет мне тот же читатель. — Разве такое возможно? Какая же это геометрия будет, если часть многоугольников "урезать"? Знания получатся неполными".

Ну конечно, соглашусь я. Что это за человек будет с неполной геометрической подготовкой?

Но вот проблема: что за гражданин получится с "соляночными" историческими знаниями?

Впрочем, здесь следует поставить вопрос шире: а нужен ли нынешнему режиму **гражданин**, т.е. человек, отождествляющий себя со своей страной, ее историей, культурой, языком? Может, предпочтительнее некий неразмышляющий, но непременно исполнительный "винтик"? Такому, разумеется, не требуются ни история родной страны, ни ее культура и язык.

Для "винтиков" вообще история должна подаваться максимально укороченным курсом. Лучше всего белорусская история, конечно же, будет выглядеть, начиная с 1994 года. Собственно, этот почти полуторадесятилетний период и является настоящей белорусской историей. Все, что было до того, это эрзац, некая предыстория. А настоящая история — это агрогородки, ледовые дворцы, селекторные совещания, вплоть до явления народу четырехлетнего Николая, объявленного наследником престола.

Правда, кое-кому может показаться, что этот период вмещает в себя еще кое-какие события. Например, протестные демонстрации на улицах Минска, избиения людей, решившихся публично выразить собственное мнение, и бесчисленные суды над ними, гонения на независимую прессу, изгнание из вузов "непокорных" студентов, жестко контролируемые выборы и референдумы с предсказуемым результатом, "исчезновения" видных деятелей оппозиции, коррупционные скандалы, в которых замешано высшее чиновничество... Кстати, по поводу последних. Меня всегда умиляют речи Главного начальника, грозящего видным коррупционерам наручниками и тюрьмой. Хочется тем не менее спросить: "А с чьего, собственно, позволения эти вороватые людишки оказались на высоких постах? Кто их туда назначил? И не должен ли в первую очередь отвечать именно назначивший их?" Впрочем, поза унтер-офицерской вдовы для наших "вождей" не характерна. Они больше по другой части...

Возвращаясь же к "историческим размышлениям", заметим: те, кому кажется, что все эти факты — "исчезновения", избиения и проч. — "тоже история", люди с несомненно искаженным историческим восприятием. Они плохо учились в школе. И вот "укороченная" школьная историческая программа как раз и поможет молодому поколению усвоить то, что действительно ему необходимо.

Коротенький, необременительный исторический курсик — и для "винтика" достаточно. Мало ли что в других европейских странах в школах преподается национальная история, что этот предмет считается там основообразующим личность будущего гражданина? Европа нам уже давно не указ. У нас свой путь. Больше "винтиков"! В стране "шкварки и чарки" других не требуется.

II

Впрочем, курс на болванизацию общества взят не сегодня. В стране уже давно жестко и последовательно внедряется бескультурье. Хотя никакого специального заговора тут не существует. Этот самый курс естественен, ибо натурально "проистекает" от существа правящей верхушки, которую нынче принято называть гордым словом "элита". Эта самая "элита", как мы знаем, у нас еще та! И образование у нее капитальное, и нравственность на высоте. Она тебе и про деятельность Скорины в Петербурге расскажет, и про стихи Василя Быкова, и морали научит, не будучи обремененной ею.

Так что процесс самый что ни на есть естественный. За последнее десятилетие произошло невероятное падение культурного уровня в Беларуси. По сути разрушен и отправлен в некий андеграунд культурный слой, который задавал тонус в общественной жизни. Разрушены литературная жизнь, литературный процесс, несмотря на номинальное существование нескольких государственных журналов и газет. Нет литературных вечеров, дискуссий, полемик... Нет ни в государственной прессе, ни на государственном телевидении и радио выступлений подлинных белорусских интеллектуалов, литераторов, историков, философов, публицистов. Всюду царит "попса" вкупе с обслуживающим власть "идеологическим персоналом". Собственно, последний — это тоже "попса", только идеологическая.

Полной девальвации подверглась у нас журналистская профессия. Я не раз писал об этом. Сейчас же хочу подчеркнуть: когда процесс болванизации общества растягивается на долгие годы, то в конце концов наступает период, когда то, что считалось позорным, то, что считалось извращением, становится "нормой". Причем находятся деятели, которые желают эту "норму" обосновать, возвысить, придать ей черты идейного благородства. И, естественно, тем самым подкрепить собственную "идеологическую позицию". Так сказать, утешить себя, успокоить некие остатки совести...

Интернет-газета "Белорусские новости" приводит такую автохарактеристику выступающего на ее страницах шефа Белорусского телевидения А.Зимовского: "Называет себя основоположником, теоретиком и практиком охранительного направления в белорусской тележурналистике. Вслед за Пушкиным считает журналистику "рассадником государственных людей". Разумеется, приятно числить Пушкина в своих идеологических предшественниках. Но, видимо, на факультете журналистики Львовского военно-политического училища, где формировался культурный уровень г-на Зимовского, дело с преподаванием русской литературы обстояло неважно. В противном случае тамошние педагоги должны были объяснить курсанту, что говоря о "сословии журналистов" как "рассаднике государственных людей", Пушкин имел в виду идеальную ситуацию, т.е. необходимость участия в прессе широко мыслящих и, безусловно, нравственных личностей. Которые, конечно же, нисколько не должны быть похожи на примитивных идеологических лакеев. В начале 30-х годов XIX века, когда были сказаны слова о "государственных людях", власть закрыла "Литературную газету", журнал "Московский вестник", лишив поэта и его окружение общественной трибуны. Возможно, г-н Зимовский думает, что Пушкин, как государственник, приветствовал такую политику правительства. Потому что сам г-н Зимовский скорее всего не имеет ничего против как закрытия ряда газет, так и лишения их, как, к примеру, "Народной воли", нормальных условий существования. Во всяком случае эта тема не занимает умы "аналитиков", содержащихся на БТ.

Вынужден разочаровать г-на Зимовского. Его "государственничество" не имеет ничего общего с государственничеством Пушкина, всю жизнь воевавшего с "сукой цензурой" (слова поэта из его письма к Вяземскому). Так что подальше, подальше от Пушкина, г-н Зимовский! Неровен час увлечетесь — карьеру испортите. И не следует смешивать лакейство с подлинным служением Родине. *"Свободы сеятель пустынный, я вышел рано, до звезды..."* — сказал о себе поэт. А вот чего сеятель г-н Зимовский? Здесь открывается широчайшее поле для рассуждений. И я не решусь — по этическим соображениям — приводить те выразительные характеристики деятельности *"работающего на правительство"* шефа БТ, которыми уснащен Интернет.

Скажу образно. Признание в принадлежности к *"охранительному направлению в журналистике"* сродни кокетству лакея, любящего в отсутствие господ допивать остатки из винных бутылок, а потом перед зеркалом примеривать на себя мундир хозяина, служащего в полиции. *"Пусть говорят! А я вот какой! Я не стыжусь! Я открыто заявляю, что служу своему господину и больше всего на свете люблю французское вино и полицейский мундир!"*

Да ради бога, г-н Зимовский! И до вас были "услужающие" журналисты. Только они об этом не кричали на весь свет. Какая-то частичка стыда все-таки была и у них. Нынче, как уже говорилось, времена иные. Теперь публично человек заголяется, лижет и кричит дурным голосом: "Заголяюсь! Лижу!"

Читатель, наверное, заметил: я люблю цитировать Щедрина. Писателя на все времена. Вот и определяя суть современного ему *"охранительного направления в журналистике"*, Михаил Евграфович сказал: *"Агонизирующая тоска и разработка шкурного вопроса"*.

Не просто сказал — припечатал, пригвоздил. И тех, живших рядом с ним уродов-современников, и их отвратительных детенышей, народившихся спустя многие десятилетия.

АТАМНЫ ПРАЕКТ

Расіі, Францыі і ЗША прапанавана будаваць беларускую АЭС

Беларусь накіравала Расіі, Францыі, ЗША прапановы па ўдзеле ў будаўніцтве АЭС. Аб гэтым паведаміў намеснік дырэктара РУП "БелНДПІэнергапрам" (генеральны праекціроўшчык па стварэнні АЭС у Беларусі) Уладзімір Баброў.

"Мінэнерга" падрыхтаваны і накіраваны запрашэнні зацікаўленым бакам — кампаніям з Расіі, Францыі, ЗША — пацвердзіць магчымасць іх удзелу ў міжнародным конкурсе, які плануецца аб'явіць у Беларусі на будаўніцтва АЭС", — сказаў Уладзімір Баброў. Паводле яго слоў, чакаецца, што адказ ад кампаній — патэнцыяльных партнёраў паступіць на працягу месяца.

Уладзімір Баброў растлумачыў, што цяпер у свеце павялічваецца колькасць заказаў на будаўніцтва АЭС, і неабходна вывучыць магчымасці асноўных пастаўшчыкоў па ўдзеле ў міжнародным тэндэры ў Беларусі. У прыватнасці, запрашэнні накіраваны расійскай кампаніі "Атамбудэкспарт", амерыканяпонскай "Весцінгауз-Ташыба", французскай "Арэва".

Як адзначыў дырэктар РУП "БелНДПІэнергапрам" Андрэй Рыкаў, тэндэр на будаўніцтва АЭС пакуль не аб'яўлены, таму што для гэтага неабходна яшчэ прайсці пэўныя працэдуы. Але, безумоўна, выбар пастаўшчыка абсталявання для АЭС будзе ажыццяўляцца на конкурснай аснове.

РЭЗАНАНС

Справядлівасць перамагла

Цікавы працяг мела спроба адабраць у вуліцы пасёлка Руба, што на Віцебшчыне, імя загінуўшага ў Афганістане хлопца, пра што наша газета распавяла ў адным з мінулых нумароў.

Як нам паведамілі жыхары Рубы, пасля таго, як пра *рашэнне пасялковага выканкама стала шырока вядома, віцебскія гарадскія ўлады вырашылі ўмяшацца ў сітуацыю і сваім рашэннем пакінулі вуліцы імя Віктара Дольнікава. Да таго ж на школе, дзе вучыўся Віктар, і на доме, дзе жыла яго сям'я, з'явяцца мемарыяльныя шыльды. А на пачатку чэрвеня ў пасёлку зладзяць урачыстасці, прысвечаныя Віктару Дольнікаву.*

Нагадаем, Віктар Дольнікаў загінуў у Афганістане ў 1983 годзе. У 1993-м пасялковыя ўлады вырашылі назваць яго імем вуліцу, а праз 15 гадоў адмянілі сваё рашэнне — нібыта па просьбах жыхароў вуліцы.

ПРАБЛЕМА

«Нікому няма да мяне справы, хоць кладзіся і памірай»

Знямоглы і бездапаможны інвалід паўгадзіны праляжаў на халоднай падлозе ўласнай кватэры. Супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях дапамагчы інваліду адмовіліся...

Аляксандр Анатольевіч Гурскі — інвалід першай групы. Ужо шмат гадоў ён пакутуе на страшную хваробу — міяпатыю. Міяпатыя — гэта хранічнае, прагрэсіруючае захворванне мышцаў, якое звязана з парушэннем абмену рэчываў у мышачнай тканцы. Для міяпатыі характэрная мышачная слабасць і атрафія мышцаў.

Па хаце Аляксандр Анатольевіч перасоўваецца, абапіраючыся на мыліцы. Пажылы чалавек амаль не адчувае ўласных ног. Кожны рух даецца яму з болем і бояззю, бо ўпасці можна ў любы момант...

"Я стараюся перасоўвацца па хаце вельмі асцярожна, бо, як бачыце, жыву адзін, разлічваю літаральна кожны крок, каб не было бяды", — гаворыць Гурскі.

... Бяда прыйшла да Аляксандра Анатольевіча 26 красавіка. *"Было каля 12 дня. Я стаяў на кухні, каля пліты,* — узгадвае Гурскі. — *І раптам у мяне закружылася галава, я адчуў, што губляю раўнавагу. Усё адбывалася цягам некалькіх імгненняў. Я апынуўся на падлозе. Прычым рука была заціснутая стулам. Сіл зварухнуцца ў мяне не было".*

Гурскі зразумеў, што аднаму яму не справіцца — стаў клікаць на дапамогу. Прыйшоўшая наведаць інваліда знаёмая не змагла дапамагчы — для таго, каб падняць грузнага мужчыну, у яе папросту не хапіла сіл. *"Пакуль пасля падзення сабраўся з думкамі, прайшло хвілін 10*, — працягвае Аляксандр Анатольевіч. — *Стаў тэлефанаваць блізкім знаёмым, дзякуй Богу тэлефон заўсёды ў кішэні. Але, як на зло, нікога з іх у тую суботу ў Мінску не было. Тым часам я адчуваў, як у мяне халадзеюць ногі, трываць далей было нельга, трэба было нешта вырашаць".*

Тады Гурскі вырашыў набраць "101" — службу Міністэрства па надзвычайных сітуацыях: *"Там мне сказалі, што на мой выклік не паедуць, бо ніякай надзвычайнай сітуацыі ў маім падзенні няма. Нічога ж у хаце не гарыць. Да таго ж паведамілі, што выезд каштуе 30 тысяч рублёў. Я абяцаў аплаціць выезд, аднак МНСнікі вязджаць адмовіліся. Памятаю, я ледзьве не расплакаўся ад крыўды. Мне ўвогуле хвалявацца нельга, а тут ляжыш на падлозе, ногі хворыя халадзеюць, а нікому няма да цябе някай справы, хоць памірай".*

Праз некалькі хвілін Гурскі набраў тэлефон 101 паўторна. *"Я проста стаў з імі лаяцца,* — гаворыць Аляксандр Анатольевіч. — *Кажу: дык што, мне трэба ўласнаручна падпаліць сваю кватэру, для таго каб мне нарэшце дапамаглі? Не ведаю, напэўна, менавіта гэтая пагроза падзейнічала, праз некалькі хвілін прыехала міліцыя. Праўда, да гэтага моманту мяне ўжо ўзнялі — гэта зрабілі хлопцы, якія выпівалі каля майго пад'езда".*

Але Гурскі мірыцца з такой сітуацыяй не стаў. Літаральна праз дзень ён напісаў зварот на імя міністра па надзвычайных сітуацыях Беларусі Энвера Барыева. Сітуацыя, у якой апынуўся Аляксандр Анатольевіч, самая што ні на ёсць надзвычайная, таму і адрасата Гурскі, здаецца, выбраў правільна. Аднак з Міністэрства па надзвычайных сітуацыях на імя Гурскага прыйшоў несуцяшальны адказ: *"...Паколькі Ваш выклік не быў звязаны з пагрозай ці ўзнікненнем надзвычайнай сітуацыі, супрацоўнікі цэнтра аператыўнага ўпраўлення МНС не мелі права накіраваць да вас дзяжурнае падраздзяленне, паколькі ў адпаведнасці з артыкулам 9 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб органах і падраздзяленнях па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь" прыцягненне органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях да выканання задач, не ўскладзеных на іх заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, забараняецца".* Дакумент падпісаў намеснік Энвера Барыева Барыс Барынгольц.

Дзіўна, але факт: прадстаўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях не кампетэнтны ў тым, каб дапамагчы нямогламу адзінокаму інваліду ўзняцца з падлогі. Гэта пры тым, што па айчынным тэлебачанні можна ўбачыць сюжэты аб тым, як бравыя падначаленыя Барыева здымаюць з дрэваў, кошак, што апынуліся там.

"Мы дапаможам інваліду, але не ў нядзелю"

Паверыць у тое, што ніводная служба ў Беларусі не прыйдзе на дапамогу інваліду, мы адмаўляліся. І правялі сваё ўласнае расследаванне. Перш-наперш патэлефанавалі ў Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Кастрычніцкага раёна сталіцы, у якім пражывае Аляксандр Гурскі. Дарэчы, цэнтр месціцца амаль побач з домам Аляксандра Гурскага. Інвалід жыве на Ляўкова, 10, а цэнтр знаходзіцца на Ляўкова, 19.

Там нам сказалі, што дапамагчы інваліду змаглі б.

— У пераліку паслуг, якія мы аказваем насельніцтву, ёсць "разавая сацыяльная дапамога", — распавяла супрацоўніца цэнтра. — Гэта каштуе 1069 рублёў. Іншая справа, як бы жанчына, якая працуе ў нас сацыяльным работнікам, змагла б чыста фізічна падняць мужчыну? Але яна яго не кінула б. Мы сталі б турбаваць суседзяў. Карацей, чалавека ў бядзе не кінулі б.

— Атрымліваецца, што сацыяльны супрацоўнік у вас адзін?

— Так, і яна вельмі загружаная. Кадравая праблема стаіць вельмі востра, недахоп сацыяльных работнікаў існуе і ў іншых цэнтрах...

— Прабачце, але інвалід упаў у суботу — выхадны дзень...

— У суботу з 9 да 13 у нас працуе дзяжурны, які разабраўся б у сітуацыі, і мы чалавеку дапамаглі б. Адзінае што — нядзеля ў нас выхадны.

Абзвон некалькіх прыватных устаноў, якія ажыццяўляюць догляд інвалідаў на даму, таксама плёну не прынёс. Разавую дапамогу там калі і аказваюць, то яна заключаецца ў пакупцы прадуктаў і ўборцы кватэры. А ў сітуацыі, якая адбылася з Гурскім, раяць наймаць сядзелку, якая б пастаянна прыглядвала за хворым.

* * *

Па сутнасці, праблема засталася адкрытай. Канечне, добра, што ў цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва адгукнуліся б на просьбу інваліда. Але, калі б здарэнне адбылося ў нядзелю, то нават, калі б патэлефанаваў туды Гурскі, вынік б гэта не прынесла. Але ж інвалід нават і не падазраваў, што ў некалькіх метрах ад яго дома месціцца сацыяльны цэнтр, супрацоўнікі якога і павінны дапамагаць такім, як ён...

* * *

Адмахнулася ад праблемы і МНС. Ведамства, якое змагаецца з надзвычайнымі здарэннямі, сітуацыю Гурскага надзвычайнай не палічыла. Уратаванне жыцця аднаго чалавека, як высветлілася, не ў іх кампетэнцыі...

Але ж ад няшчаснага выпадку не застрахаваны ніхто. З кожным з нас нешта падобнае можа здарыцца ў любую хвіліну... Хтосьці ж нам павінен дапамагчы. Дык няўжо толькі мы самі?..

Віталь ГАРБУЗАЎ.
Фота аўтара.

Народная Воля http://www.nv-online.info
28 МАЯ 2008 г.

О ТОМ, ЧТО ВОЛНУЕТ

Мутанты

Александр ЯРОШУК, *председатель Белорусского конгресса демократических профсоюзов*

Как известно, мутацией называется явление, в результате которого живое существо под воздействием неких внешних обстоятельств меняет свои свойства. С точки зрения биологии, мутация всегда считалась опасным явлением, которое приводит к нежелательным для биологической особи и его потомков последствиям. В применении к человеку это означает, что при сохранении традиционного облика он полностью меняет свою внутреннюю сущность, происходит процесс перерождения человеческой личности. Иными словами, меняются ценностные установки, человек деградирует.

Белорусское общество сегодня представляет уникальный пример самых разнообразных мутаций как отдельно взятых личностей, так и целых социальных групп. Для ученых-обществоведов, психологов и психиатров наша страна могла бы стать бесценным кладезем научного материала.

Жаль только, что в силу известных обстоятельств ученые в нашей стране не имеют возможности открыто проводить научные исследования процессов перерождения человеческой личности, порождающих их причин и обстоятельств. В большинстве случаев приходится довольствоваться только констатацией конкретных фактов этих поучительных явлений, которые, словно СПИД, сопровождают общественную жизнь таких недемократических, тоталитарных режимов, как белорусский.

Попробуем и мы, не претендуя на глубокую научность, коснуться этой темы. Любопытно проследить на примере отдельных субъектов, как осуществлялось деформирование их человеческой личности, приведшее к глубокому и стойкому расстройству морального здоровья, психическому перерождению.

Общеизвестный факт: Белорусское телевидение вот уже ряд лет пичкает своих телезрителей такой стряпней, таким уродливым, низкопробным продуктом, который способен не только надолго лишить рядового гражданина страны аппетита. Дело дошло до того, что впору напротив кнопки БТ размещать, подобно тому, как это делается на пачках сигарет, предупреждающую надпись "Просмотр передач Белорусского телевидения опасен для Вашего здоровья", подразумевая прежде всего психическое здоровье людей, поскольку содержание многих передач переполнено ненавистью и злобой до такой степени, что создается впечатление, будто бы телеведущие изрыгают из себя не слова, а потоки брани и зловония.

Но кто же эти люди, добровольно согласившиеся участвовать в столь низкопробном, сомнительном занятии, которое, может быть, щедро оплачивается материально, но приводит к законченной и полной моральной деградации? Какая нужда заставила их выставить напоказ свою моральную и человеческую ущербность, ибо полагать, что они делают это в силу идейных соображений, вряд ли имеются основания?

Эти мысли приходят в голову всякий раз, когда лицезреешь перед собой на телеэкране вроде бы обычных, а зачастую и вполне привлекательных внешне людей. Людей, как правило, достаточно молодых, которые формировались как личности уже не в советское, а в наше время, когда обо всем, *"что такое хорошо и что такое плохо"*, можно было судить вполне предметно и сознательно делать свой выбор, кому и чему служить.

Помню давнишний разговор с заслуженной артисткой Беларуси, популярной, привлекательной телеведущей Зинаидой Бондаренко. Эта обаятельная женщина, в течение долгих лет визитная карточка БТ, кумир нескольких поколений телезрителей, вынуждена была уйти около десяти лет назад с телевидения, так и не приняв порядки, которые стали исподволь там устанавливаться. Порядки, при которых мало-помалу размывались нравственные установки, стала править бал воинствующая посредственность, которая становилась непримиримым антагонистом таланту вкупе с порядочностью. З.Бондаренко называла фамилии многих известных сотрудников телевидения, стремящихся делать белорусский телеэкран умным, привлекательным, если хотите, человечным. Но агрессивная серость заставила их уйти. Думающие, самостоятельные, чистоплотные личности оказались не только не востребованными новой властью, но и были для нее опасны в таком стратегически важном месте, как телевидение. И наступила эра людей, имена которых за последнее время превратились в нарицательные, олицетворяющие собой понятия ненависти, лжи, вранья, фарисейства, обмана, низости, подлости. То есть всех возможных пороков и дурных наклонностей, которые могут проявиться в человеке в условиях, когда его на это сознательно провоцируют и поощряют. А также тогда, когда имеют место вседозволенность и отсутствуют внутренние моральные тормоза, регулирующие поведение всякой воспитанной, с навыками культуры поведения личности. Которые диктуют, что позволительно делать и говорить публичному человеку, вещающему на телеаудиторию в сотни тысяч человек, а на что существует строжайшее табу. Поскольку озвучивающий мерзости телеведущий мерзок ровно в той же степени, в которой он позволяет себе говорить в таком тоне о других. Не больше, не меньше.

Скажите, что вы будете думать о людях, которые позволяют себе называть трагедию жен пропавших в Беларуси политиков расчетливым со стороны последних бизнесом? Скажите, до какого беспросветного мрака должна почернеть человеческая душа, какие бесы должны в нее вселиться, чтобы вместо слов обыкновенного и естественного в таких случаях сочувствия обезумевшим и мечущимся от горя в поисках хоть какой-нибудь правды о происшедшем с их мужьями и сыновьями женщинам стремиться морально их растоптать, уничтожить в глазах общественного мнения страны? И делают это зачастую такие же женщины, чьи-то жены и матери, с мужьями и сыновьями которых в стране, где воцарилась диктатура, может случиться всякое. Одним словом, прости их Господи, ибо не ведают они, что творят.

Откуда они берутся и что ими движет, не так уж сегодня и важно. Ибо в любом случае это не есть мотивы служения народу, достойного исполнения своего гражданского долга. Обычно это всегда сводится или к высоким гонорарам, поскольку искушение щедрыми подачками со стороны режима способна перенести далеко не всякая душа, особенно молодая и незрелая. Или желанием сделать стремительную карьеру в условиях, когда можно не брезговать средствами, быть на виду, возможность чего предоставляет телевидение, неважно, по какому поводу и в каком качестве. В таких случаях можно пренебречь и пословицей: "Береги платье снову, а честь смолоду".

Есть и такие, с позволения сказать, экземпляры, которых повязали компроматом. Говорят, один стареющий ведущий, с особым темпераментом и усердием изобличающий, клеймящий позором догнивающий Запад и превозносящий до неземных высот белорусские порядки, переменил свою демократическую ориентацию в мгновение ока после того, как был пойман с поличным на махинациях с жильем. Да еще на нетрадиционных сексуальных увлечениях, или, попросту говоря, педофилии. Не будем строить догадок о достоверности этого факта, ибо они теряют всякий смысл на фоне низкого и грязного ремесла, которым подобные люди сочли для себя возможным заниматься. Духовный стриптиз, как известно, куда более отвратителен и мерзок, чем стриптиз физический.

В любом из приведенных случаев имеет прямой смысл говорить о мутациях. Когда процесс формирования гармонично развитой личности вдруг дает сбой и взбесившаяся природа навевает сон разума, заглушает стыд и совесть человека, порождая на месте еще вчера нормального человека в его физической оболочке чудовище. Может быть, Беларусь со временем станет местом, где появится первая в мире кунсткамера для личностей не с физическими, а моральными пороками? Чем черт не шутит, тем более в условиях огромного избытка различного и на разный вкус человеческого материала...

К примеру, в том же молодежном движении, официально патронируемом со стороны государства. Вспоминаю, как все это когда-то, лет девять тому назад, начиналось. Поползли вдруг разговоры, что появилась некая экстремистская молодежная организация с исключительно наглым, развязным поведением ее членов. Провозгласив своей идеологией и взяв на вооружение лозунги поддержки недавно избранного президента, под видом борьбы с засильем бюрократии они могли позволить себе врываться в кабинеты любых руководителей, угрожать и требовать. Внешне это было очень похоже на действия китайских хунвейбинов во времена культурной революции в 60-е годы минувшего столетия.

На одном из возложений венков, которое проводится на столичной площади Победы высшим руководством страны, они уже стояли шумной, крикливой толпой, держали над головами и скандировали лозунги в поддержку президента. Тот не замедлил к ним подойти и пустился в пространные разговоры, после чего стало ясно, что ни о какой в данном случае самодеятельности не может быть и речи, что все это действо с хорошо прописанным сценарием. Я обратился к одному из руководителей силовых структур, имеющему прямое отношение к вопросам государственной безопасности, с вопросом, не думает ли он, что такого рода игры с молодежью небезопасны для государства. Он, не колеблясь, утвердительно кивнул и добавил, что все это может далеко зайти и ничего хорошего для общества не сулит.

Затем происходили организационные мероприятия по созданию новой молодежной пропрезидентской организации — Белорусского патриотического союза молодежи (БПСМ). Уже на том этапе становилось понятно, что строительным материалом для ее формирования являются молодые люди с низкими моральными и культурными запросами. А цементирующим раствором для ее строительства стал откровенный цинизм некоторой части молодых людей, смекнувших, что в этом деле они могут извлечь для себя немалую личную выгоду.

Цинизм небезопасен всегда. А для молодой, не сформировавшейся личности он просто страшен. Прививка цинизма в молодом возрасте способна сделать человека духовным инвалидом, моральным уродом на всю оставшуюся жизнь. Что, в общем-то, и происходило все эти годы.

Любопытно было наблюдать за новоиспеченными вождями "правильной" белорусской молодежи. Тонко уловив политическую конъюнктуру, они постарались выжать из государственного бюджета максимальное количество благ. Словно в самом деле далеко не богатому народу не оставалось других забот, чем содержать за свой счет молодых бездельников и лоботрясов, все заслуги и достижения которых ограничивались заверениями в беспредельной преданности делу президента. Хорош, однако, бартер, нечего сказать.

Судя по всему, игры во всенародную любовь белорусской молодежи к своему президенту понравились многим. Но ведь совершенно очевидно, что любовь эта по расчету, поскольку щедро проплачена, и идейности в ней ровно столько, сколько подлинной страсти у торгующей своим телом проститутки. Поэтому вся эта массовость организации, которая теперь уже носит название "Белорусский республиканский союз молодежи (БРСМ)", не должна никого вводить в заблуждение. Основана она на двух составляющих — щедрых подачках со стороны государства, в том числе в виде всевозможных льгот, да на принуждении молодежи вступать в ее ряды под угрозой возможных неприятностей и репрессий по месту учебы или работы. Согласитесь, и то, и другое никак нельзя назвать нормальным явлением.

Но самое неприятное в официальной молодежной политике нынешних белорусских властей не те материальные затраты, которые вынуждено по их милости нести общество на содержание значительной армии молодых тунеядцев. Куда опаснее моральные издержки: в результате подобных действий происходит развращение определенной части молодежи, мутация и деформирование личности молодых людей. А на исправление этих пороков потребуются многие годы и десятилетия.

АБЗАЦАМ

Турысты абмінаюць Беларусь

Са студзеня па май бягучага года Беларусь наведала амаль 14 тысяч арганізаваных турыстаў, пераважная большасць з якіх — гэта грамадзяне СНД.

Летась колькасць турыстаў была на 3 тысячы большай — паведамляе Міністэрства статыстыкі і аналізу Беларусі.

Асноўная частка турыстаў у Беларусь прыязджае з Расіі. Больш за 1,5 тысячы турыстаў прыехала ў Беларусь з Турцыі, з Італіі — 591, Вялікабрытаніі — 482. Колькасць турыстаў з ЗША, Польшчы, Літвы і Швайцарыі не перавышвае 300 чалавек.

Збіты брат Барыса Хамайды

Віцебскі апазіцыянер Барыс Хамайда паведаміў, што на ягонага брата Вячаслава быў здзейснены напад. Ён не выключае, што такім чынам рэалізавалі свае даўнія пагрозы прыхільнікі прафашысцкай арганізацыі "Русское национальное единство". Паводле апісання Вячаслава Хамайды, малады хлопец гадоў пад дваццаць напаў на яго па дарозе з лецішча: збіваў нагамі, да крыві разбіў твар, і ўсё гэта моўчкі, без ніякіх тлумачэнняў. Узбуджана крымінальная справа. Але, па традыцыі, міліцыя наўрад ці каго знойдзе.

«Катынская справа» застаецца сакрэтнай

Галоўная ваенная пракуратура Расіі адмовілася прадставіць у суд матэрыялы "катынскай справы" — аб расстрэле беларускіх і польскіх афіцэраў у лясах Смаленскай вобласці падчас Другой сусветнай вайны. Падчас пасяджэння ў Хамоўнічскім судзе Масквы па скарзе сваякоў польскіх афіцэраў, якія просяць адмяніць рашэнне аб спыненні "катынскай справы", прадстаўнік пракуратуры паведаміў, што большасць са 183 тамоў маюць грыф "Сакрэтна" і "Цалкам сакрэтна". "Мы не можам прадставіць у суд ні матэрыялы справы, ні пастанову аб спыненні справы №159, бо гэтыя матэрыялы адносяцца да дзяржтайны", — сказаў пракурор.

Беларусі даверылі правядзенне юнацкага хакейнага чэмпіянату свету

Такое рашэнне прынята на штогадовым кангрэсе Міжнароднай федэрацыі хакея, які прайшоў у Канадзе. Першынство прызначана на 6—12 красавіка 2009 года. Яно пройдзе ў сталічным Палацы спорту. За адну элітную пуцёўку з беларускімі хакеістамі пазмагаюцца зборныя Казахстана, Літвы, Польшчы, Украіны і Венгрыі.

Ігар РЫНКЕВІЧ: «Хутка адвакатаў прымусяць хадзіць строем»

На 20 чэрвеня ў Міністэрстве юстыцыі запланавана Рэспубліканская нарада адвакатаў.

Паведамляецца, што на нарадзе будуць разгледжаны пытанні дзейнасці адвакатуры па абароне правоў і законных інтарэсаў грамадзян, а таксама эфектыўнасці і даступнасці правасуддзя.

Але насамрэч у адвакацкім асяродку Беларусі зараз назіраецца крызіс. Па сутнасці адвакаты сталі фармальным дадаткам да судовых працэсаў. Часцяком іх довады застаюцца не пачутыя.

Юрыст, экс-адвакат Аляксандра Казуліна Ігар Рынкевіч у размове з карэспандэнтам "Народнай волі" адзначыў, што наўрад ці на нарадзе будуць узняты прынцыповыя і злабадзённыя пытанні:

"Адвакат — гэта прафесійны праваабаронца, — кажа Рынкевіч. — Трэба адзначыць, што нарматыўна-прававая база, існуючая ў Беларусі, не дазваляла адвакатам быць актыўнымі і раўнапраўнымі ўдзельнікамі працэсу. А пасля прыняцця новага крымінальна-працэсуальнага кодэксу правы, якія нададзены адвакату, увогуле засталіся толькі ў тэорыі. Асабліва гэта тычыцца палітычна-матываваных працэсаў альбо працэсаў, дзе праследжваецца яўны інтарэс дзяржавы. У такіх працэсах адвакат у сённяшніх умовах можа працаваць толькі на перспектыву. Іншымі словамі, доказная база збіраецца са спадзевам на тое, што пасля змены ўлады многія справы будуць перагледжаны".

Ніякіх кардынальных перамен у заканадаўстве пасля нарады ў Міністэрстве юстыцыі Рынкевіч не прагназуе.

"У сваю бытнасць у адвакатуры я сустракаў вельмі мала смелых людзей, — працягвае Рынкевіч. — Тыя нямногія, якія імкнуліся ставіць злабадзённыя пытанні, — Надзея Дударава, Вера Страмкоўская, Гары Паганяйла — знаходзіліся ў меншасці. Я больш чым сумняваюся, што нехта асмеліцца падняць на нарадзе прынцыповыя пытанні. Хутчэй за ўсё прынцыповасць сыдзецца на тым, што некаторыя будуць настойваць на паляпшэнні аплаты працы. Напэўна, пры такім падыходзе і замоўчванні прынцыповых пытанняў адвакатаў хутка апрануць у мантыі і прымусяць хадзіць строем".

Віталь ГАРБУЗАЎ.

Аляксей МАРАЧКІН: «Гэта вобраз пакутаў і плачу»

Мастак Аляксей Марачкін аднавіў пашкоджаны вандаламі абраз Маці Божай Курапацкай на каплічцы ў Курапацкім лесе.

Адноўлены абраз маці Божай Курапацкай.

Аляксей Марачкін прыехаў у Курапацкі лес разам з сынам Ігарам. Яны знялі дошку з капліччкі, да якой быў прымацаваны знявечаны вандаламі абраз Маці Божай Курапацкай і на яе месца прымацавалі новую рэпрадукцыю. Аляксей Антонавіч сказаў, што забірае пашкоджаную выяву для музея вандалізму.

Арыгінал абраза Маці Божай Курапацкай усіх нявінна расстраляных напісаны мастаком каля пяці гадоў таму і знаходзіцца ў Чырвоным касцёле. Рэстаўрацыяй рэпрадукцыі на каплічцы ў вядомым усяму свету ўрочышчы стваральнік рэліквіі займаецца ўжо трэці раз.

— Тое, што ў чарговы раз нарабілі вандалы, — гаворыць ён, — канешне, уражвае. Мы з сынам Ігарам думаем зрабіць плакат, прысвечаны Курапатам. Калі мярзотнікі абрывалі гэтую выяву, то нейкім чынам застаўся яе маленькі фрагмент — вока Маці Божай і яе слёзы. Гэта так сімвалічна! Гэта вобраз пакутаў і плачу. Аднаўляючы каплічку, будзем спадзявацца, што, можа, усё ж такі ў тых, хто робіць чорную справу, прачнецца сумленне. Гэта ж месца бязвінна расстраляных продкаў.

Каплічка была ўсталяваная на Дзяды ў 2003 годзе побач з Крыжам Пакуты на ўваходзе ў Курапацкі лес. І, нягледзячы на разгул злачынцаў, кожны раз паўстае адноўленай.

Алесь ДАШЧЫНСКІ.

Аляксей Марачкін забраў з сабой пашкоджаны абраз. Ён сказаў: "Для музея вандалізму".

Развітанне са школай

Выпускныя вечары з уручэннем атэстатаў аб агульнай сярэдняй адукацыі пройдуць 7 і 8 чэрвеня.

Адпаведны загад падпісаны ў Міністэрстве адукацыі Беларусі.

ПАРАЎНАЕМ

Сярэдні заробак у Расіі дасягнуў 688 долараў

Нават у самай нізкааплачваемай сферы — сельскай гаспадарцы — заробак перавысіў 300 долараў.

Сярэдняя налічаная зарплата ў Расіі ў красавіку 2008 года склала 16.253 расійскіх рублі. За год яна вырасла на 28,1%. Такія звесткі распаўсюдзіў Расстат.

У сакавіку сярэдні заробак расіян складаў 16.172 тыс. рублёў. Нават у самай нізкааплачваемай сферы — сельскай гаспадарцы — заробак перавысіў 300 долараў (7123 рублі), а за долар даюць 23,6 рубля.

Нагадаем, што беларусам яшчэ толькі абяцаюць сярэдні заробак у 500 долараў. Магчыма, у наступным годзе...

ШКОЛА: РЭФОРМА

Настаўнікі выступілі з адкрытым лістом

Настаўнікі сусветнай мастацкай культуры больш як з 20 гарадоў Беларусі выступілі з адкрытым лістом наконт запланаванага скарачэння вучэбнай нагрузкі ў школе за кошт гуманітарных дысцыплін.

Тэкст адозвы БелаПАН перадала кіраўнік Мазырскага раённага метадычнага аб'яднання настаўнікаў айчыннай і сусветнай мастацкай культуры, аўтар шматлікіх работ па сваёй спецыяльнасці Святлана Філімонава. Пад лістом стаяць прозвішчы педагогаў з Гомеля, Гродна, Магілёва, Мінска, Віцебска, раённых цэнтраў. Настаўнікаў падтрымала ўдава сусветна вядомага рэчыцкага мастака Аляксандра Ісачова.

"Ідэя скараціць вучэбную нагрузку за кошт дысцыплін адукацыйнай галіны "мастацтвы", у тым ліку за кошт прадмета "айчынная і сусветная мастацкая культура", гучыць як нонсенс на фоне звароту прэзідэнта да народа і парламента, у якім гаворка ішла аб духоўным здароўі нацыі. Дысцыпліна СМК — краеугольны камень у выхаванні духоўнасці нашых дзяцей. Усяго ў трох класах па адной гадзіне ў тыдзень адводзілася гэтаму прадмету. (Для параўнання: у Расіі СМК пачынаюць вывучаць з 5-га класа і да выпуску.)

У большасці школьнікаў урокі матэматыкі будуць запатрабаваны для пераліку грашовых купюр у кашальках, хімія — для набыцця мыйных сродкаў, біялогія — каб адрозніць сардэчны боль ад ныркавага, геаграфія — для арыентацыі ў частках свету, фізіка ў быце абмяжуецца закіпаннем вады ў чайніку. Але хто мы без душы, без культурнай спадчыны мінулага? З выхаваннем у школьнікаў патрыятызму могуць справіцца толькі дысцыпліны галіны "мастацтвы". Менавіта яны ствараюць баланс "адукацыя-выхаванне". Многія настаўнікі краіны паклалі душэўныя сілы і матэрыяльныя затраты, каб прадмет гучаў, а дзеці з жаданнем прыходзілі ў кабінет мастацкай культуры. У школу прыйшлі маладыя спецыялісты з дыпломамі настаўніка СМК, сёлета атрымаюць выпускнікі педагагічных ВНУ такія ж дыпломы. А колькі паступілі на гэтую спецыяльнасць? Колькі створана работ па мастацкай культуры Беларусі і свету?

Заклікаем усіх, ад каго залежыць прыняцце рашэнняў аб адукацыі, не зрабіце памылкі. Нашчадкі гэтага не даруюць", — гаворыцца ў лісце настаўнікаў.

Як зазначыла С.Філімонава, падобныя лісты былі накіраваны ў Адміністрацыю прэзідэнта і Беларускі экзархат.

Алена ГЕРМАНОВІЧ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
28 МАЯ 2008 г.

ЕСЛИ БЫ Я БЫЛ ПРЕЗИДЕНТОМ...

Распоряжаться землей должен фермер, а не чиновник!

Если бы я был президентом, то поддержал бы фермерство, принял бы государственную программу его развития, передал бы землю фермерам в частное наследуемое владение.

Рано или поздно мы, как и весь мир, к этому придем. Ведь только фермеры могут облагородить землю, сделать Беларусь зажиточной страной.

В первой половине 90-х годов прошлого века молодая белорусская демократия открыла дорогу фермерству, и по этому пути устремились многие. Но, оказавшись наедине со своими проблемами, во враждебном окружении бюрократов и "красных помещиков", фермерство пошло на убыль.

Руководство нашей страны довольно долго гордилось, что в Беларуси все еще действуют колхозы, пусть и под иными названиями. Сегодня этим гордиться нельзя: время доказало нежизнеспособность хозяйств советского типа. Их переименование в СПК, присоединение слабых хозяйств к сильным или к богатым городским предприятиям лишь на первых порах улучшало статистику. Нынешние колхозы под названием СПК — самая уродливая, на мой взгляд, форма собственности, и чем дольше она будет сохраняться, тем хуже последствия для национальной экономики. И видно это каждому, кто хочет видеть. Ведь неслучайно самые толковые и активные люди бегут из сельской местности в города Беларуси, в Россию, страны Балтии и еще дальше.

Многие, возможно, и остались бы, если бы увидели перспективу стать хозяевами земли — самостоятельными фермерами. Такими, какие давно и успешно трудятся в большинстве стран Европы.

Но без государственного содействия создать у нас такое фермерство невозможно. Сейчас огромные бюджетные средства уходят не на поддержку фермеров, а на возведение бесполезных, показушных агрогородков. Как грибы, растут "президентские домики" на глине и в сырых низинах. Сляпанные наспех, они не устраивают даже тех, у кого пока нет крыши над головой. Но главное — вблизи от этих новостроек нет работы с достойной оплатой труда. А значит, нет и стимула к труду и укреплению семьи. Такой стимул может появиться лишь тогда, когда земля станет собственностью работающего на ней, то есть фермера, его наследников, а не чиновников.

В странах Евросоюза дело фермеров продолжают их дети, к которым по закону переходит фамильное имущество — земля. У нас я не припоминаю случая, чтобы председатель СПК или другой аграрный начальник районного уровня старался передать свою должность сыну. Напротив, он старается сделать так, чтобы дети перебрались в областной центр, столицу или вообще за рубежи Беларуси.

К сожалению, многое в организации фермерства уже упущено навсегда. Но не все потеряно. Спасти это дело можно. И выход тут один — разработка и выполнение государственной программы развития фермерства. В ней должны быть предусмотрены сервисные центры по обеспечению фермеров техникой, горюче-смазочными материалами, ветеринарными услугами, строительство проселочных дорог и так далее.

Если бы я был президентом, то сделал бы такую программу главным приоритетом своей деятельности, важнейшим направлением внутренней политики. Ведь если дать фермерам право быть хозяевами земли, то мы спасем землю для потомков, убережем деревню от вымирания, а народ — от опасности голода, вполне реальной. Сделав это, мы подвинем Беларусь к будущему и перестанем, наконец, покупать яблоки во Франции, чеснок — в Турции, а свинину — в Польше.

Владимир БОРОВКО,
давний подписчик "Народной воли",
бывший командир авиаполка.

г.Поставы.

Крымінальны скандал у Нацыянальным алімпійскім камітэце

Генпракуратура завяла крымінальную справу ў дачыненні да дарадцы па эканамічных пытаннях НАК Міхаіла Кладава. Ён падазраецца ў падбухторванні да дачы хабару ў памеры 20 тысяч долараў.

Інструктараў аўташкол накіруюць на курсы

Падрыхтоўкай кіроўцаў катэгорыі "В" будуць займацца толькі інструктары, які пройдуць спецыяльныя курсы. Пра гэта паведаміў галоўны спецыяліст Упраўлення ДАІ МУС Беларусі Аляксандр Кузьменка.

Зараз беларускія аўташколы для навучання людзей кіраванню аўтамабілем набіраюць людзей, якія маюць асабісты вопыт кіроўцы. Ніякай спецыяльнай адукацыі гэтыя людзі не маюць. Зараз у МУС падбіраюць навучальную ўстанову, якая будзе займацца падрыхтоўкай інтрукта-раў для аўташкол.

Беларускіх кароў няма каму пасвіць і даіць

У Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны паведамілі, што ў аграпрамысловым комплексе на пачатак мая налічвалася 2,2 тысячы вакансій.

Нестае ў першую чаргу даярак, трактарыстаў і пастухоў.

Прычына — малыя заробкі. Хаця Аляксандр Лукашэнка некалькі разоў у сваіх нядаўніх публічных выступах казаў, што ў шэрагу гаспадарак даяркі атрымліваюць больш за паўтысячы долараў. Праўда, адшукаць такіх пакуль нікому не ўдалося.

НЕЛЬГА МАЎЧАЦЬ

Памінальны малебен — не мітынг, а ўскладанне кветак — не злачынства

У мінулым годзе наша краіна адзначала сумную дату сваёй гісторыі — 70-годдзе піку масавых рэпрэсій у СССР.

Да мерапрыемстваў Года Памяці мы спрабавалі далучыць і органы дзяржаўнай улады. Адказам на нашы звароты былі або глухое маўчанне, або рэпрэсіі і пераслед грамадскіх актывістаў, якія ўдзельнічалі ў акцыях. Апошнім часам гэтыя брутальныя дзеянні з боку рэжыму пачалі выяўляцца ўсё часцей і часцей, набываючы недапушчальны маштаб і антынародны характар.

19 красавіка гэтага года грамадскасцю Мінска з удзелам жыхароў вёскі Дражна Старадарожскага раёна быў усталяваны Крыж на ўскраіне тамтэйшых могілак — у памяць ахвяраў карнай аперацыі, здзейсненай партызанамі Мінскай брыгады, якія па нейкай дзіўнай і жорсткай логіцы "перабылталі" паліцаяў з мірнымі жыхарамі і расправіліся з усёй вёскай. Узброеныя вінтоўкамі і нажамі, драпежнікі атрада Лапідуса накінуліся на жыхароў — жанчын і дзяцей. Зарэзалі маладую настаўніцу (вучыла дзяцей грамаце, а вучыць савецкай агентурай было забаронена), цэлымі сем'ямі заганялі сялян у хаты і палілі жывымі. Трагедыя адбылася 65 гадоў таму, у красавіку 1943 года. Крыж быў устаноўлены ў памяць дражнаўскіх пакутнікаў.

І вось ужо 22 красавіка па загадзе ўладаў гэты памятны знак быў разбураны. Адзін з удзельнікаў грамадзянскага ўшанавання вядомы грамадскі дзеяч Вячаслаў Сіўчык быў арыштаваны ў Мінску, адвезены ў Старыя Дарогі і там асуджаны на 15 сутак.

Як бачым, памінальны малебен на месцы масавых расстрэлаў улады цяпер лічаць мітынгам, а ўскладанне кветак — злачынствам. Гэта не можа не ўражваць і не абураць чалавечае сумленне.

15 мая пісьменнік Віктар Хурсік, які раней у сваёй кнізе "Кроў і попел Дражна" расказаў пра трагічныя падзеі ваеннага часу ў вёсцы Дражна і прысутнічаў пры ўсталяванні Крыжа 19 красавіка, таксама арыштаваны і пасаджаны на 15 сутак.

Суды над грамадскімі рупліўцамі праводзяцца пастаянна, прысуды не грунтуюцца ні на якіх доказах. Меркаванні адвакатаў не прымаюцца да ўвагі. Пра гэта яскрава сведчаць і апошнія судовыя працэсы над маладзёжным актывістам Андрэем Кімам і лідэрам прадпрымальнікаў Сяргеем Парсюкевічам. Складваецца пэўнае падабенства з крутым 1937-м, чаго ўлады нават не спрабуюць хаваць.

На самым пачатку гэтага года грамадству кінуты новы выклік. Высокім начальствам прынята палітычнае, як падкрэслівалася, рашэнне аб будаўніцтве атамнай электрастанцыі на Беларусі. Без усялякай незалежнай экспертызы, без прававога абгрунтавання. Парушана Орхуская канвенцыя, падпісаная нашай дзяржавай, згодна з якой рашэнне аб будаўніцтве станцыі павінен прымаць народ. Тым часам зроблены намёк, што кожны, хто выступіць супраць будаўніцтва беларускай АЭС, будзе залічаны ў ворагі народа. А з "ворагамі" вядома, што робяць нашчадкі сталінізму ў Беларусі. Ці не прадбачыцца новая паласа рэпрэсій, арыштаў, турэмных зняволенняў тых, хто будзе супраць?

Мы спадзяёмся, што грамадзяне Беларусі разбяруцца ў сітуацыі і зразумеюць, хто плодзіць "ворагаў народа" і дзеля чаго тое робіцца, не пакінуць без увагі чарговы выбух рэпрэсій у Беларусі — цынічны і недапушчальны для еўрапейскай краіны наступ на грамадзянскую супольнасць. Улады Беларусі груба парушаюць усе міжнародныя канвенцыі па абароне правоў чалавека, да якіх краіна годна далучылася ў лепшы час. Дамагаючыся абсалютнай пакорлівасці, цяперашні рэжым старанна і паслядоўна разбурае мараль, хрысціянскія традыцыі, сістэму нацыянальнай адукацыі, мову і культуру беларускага народа.

Выказваем спадзяванне, што, усведамляючы ўсё гэта, свет не застанецца да нас абыякавым.

Калісьці ў Савецкім Саюзе паняволенае і затлумленае "светлай будучыняй" насельніцтва, пакінутае цывілізаваным светам сам-насам з крывавым дыктатарам, заплаціла за гэта жахлівую цану. І Еўропа — крыху пазней — таксама. Хацелася б думаць, што ўрокі нядаўняга мінулага не забыты супольнасцю Еўропы.

Яўген АНІШЧАНКА, гісторык
Радзім ГАРЭЦКІ, акадэмік НАН Беларусі
Валерый ДРАНЧУК, публіцыст, эколаг
Сяргей ЗАКОННІКАЎ, паэт, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь імя Янкі Купалы
Георгій ЛЕПІН, доктар тэхнічных навук
Леанід ЛЫЧ, доктар гістарычных навук
Іван НІКІТЧАНКА, член-карэспандэнт НАН Беларусі, ліквідатар вынікаў аварыі на ЧАЭС
Ягор ФЯДЗЮШЫН, фізік-ядзершчык
Уладзімір ХАЛІП, кінадраматург
Васіль ЯКАВЕНКА, пісьменнік

Сыпаў бы беларускімі прымаўкамі

Паважаная рэдакцыя!

Прапаную яшчэ адзін свой допіс у рубрыку "Если бы я был президентом".

Калі б я быў прэзідэнтам, то расквечваў бы мову сваю трапнымі беларускімі прымаўкамі і выслоўямі. Пачытаўшы з вечара У.Караткевіча, зрабіў бы назаўтра выступ перад народам ці міністрам і на роднай мове, лепш за якую няма на свеце. Гледзячы на вышэйшага кіраўніка, так бы рабілі і ўсе аватнія, успомніўшы, хто яны і адкуль.

Мікалай ДЗЕМЯНЦЕЙ,
жыхар г.п.Шарашова Пружанскага раёна, сучасны селянін.

Спадар Радзькоў, вы міністр ці грамадскі дзеяч?

Праз газету "Народная воля" я хачу спытацца вось пра што: чаму ніхто не прыцягне да адказнасці грамадскага актывіста Радзькова? Ёсць жа за што. У той час, калі школа знаходзіцца ў глыбокім крызісе, хутчэй за ўсё нават у тупіку, міністр адукацыі распачаў бурную грамадскую дзейнасць, якая, вядома, шкодзіць выкананню яго прамых абавязкаў.

Мне давялося працаваць у школе і пры камуністах, і ў часы перабудовы, і ў часы станаўлення незалежнасці краіны, але большага абсурду, больш невыноснай атмасферы ў школе яшчэ не было. Можна з абсалютнай упэўненасцю сцвярджаць, што сёння ўсё робіцца для таго, каб не даць настаўніку правесці добры ўрок. Школа сёння нагадвае месца для тусоўкі (прабачце за слэнг) чыноўнікаў розных масцей, пачынаючы ад адукацыі і канчаючы міліцыяй, пажарнымі, ідэолагамі ад улады і БРСМ. Што, пан міністр, не так? Так, менавіта так! Разбухлы чыноўніцкі штат, каб хоць неяк імітаваць сваю дзейнасць і сваю значнасць, якія толькі акцыі-конкурсы не выдумляе, спускаючы іх рэалізацыю на школу, а сабе пакідаючы кантралюючую і караючую функцыі. Было б не так крыўдна, калі б гэта прыносіла хоць нейкую карысць і на самай справе было б цікава і патрэбна. А так толькі адбівае ахвоту вучыць і вучыцца.

Мільгае крамольная думка, што гэта носіць характар прамога шкодніцтва і вельмі нагадвае тэрор чыноўніцтва супраць школы. Ну, напладзіла вас гэтая сістэма, ну, няма вам чым заняцца, дык тусуйцеся паміж сабой, але не перашкаджайце іншым працаваць. Само знаходжанне ў школе сёння выклікае ў настаўніка жаданне збегчы ад гэтага чыноўніцкага дэспатызму. Што многія і робяць.

Пан міністр, навядзіце парадак у сваім агародзе, дайце настаўніку магчымасць нармальна працаваць! Ці вы ўжо бачыце сваё будучае на кіруючай пасадзе ў "Белай Русі"?

Язэп ДЗЯРГАЙ.

Мінск.

ДОЖИЛИ!

Свиные шкурки

На днях пошла в магазин за хлебом. Проходила мимо отдела, где расставлены бутылки с подсолнечным маслом. Слышу, бабулечка просит продавца: "Доченька, а может, у вас есть подешевле? Это же надо — 6 тысяч с хвостиком! Где я возьму?" Продавщица вняла мольбе и принесла бутылку впрямь "подешевле" — за 5 тысяч. Но бабушка не взяла и ее: что шесть, что пять — все равно не по карману. И, повернувшись ко мне, сказала: "Боже мой, даже после войны и то легче было, хоть надеялись на что-то..."

Это же надо уметь нашим правителям довести многих стариков до того, что они ностальгируют по тяжелым послевоенным временам.

...Рядом с магазином рынок. Разговорилась со старушкой, у которой купила кучку щавеля. Сколько боли и обиды было высказано: отмена льгот, высокие цены на самое необходимое и так далее — просто спасу нет! К нашему разговору присоединилась еще одна старушка, поделилась своим опытом выживания: она наловчилась покупать в магазине свиные шкурки и варить из них бульон для борща! Я и сама видела на витрине в магазине кулечки со свиными шкурками, цена которых и вправду доступна всем. В том числе — и нашим дорогим руководителям. Вот только знают ли они об этом? Скорее не хотят знать...

Что уж до лекарств, без которых моим собеседницам и дня не прожить, даже на самые простые и "дешевые" не хватает. А теперь, слышала, и фармацевты бьют тревогу. Нужные людям дорогие лекарства часто залеживаются нераскупленными, оказываются просроченными. Их, конечно же, вынуждены уничтожать. А люди не могут их купить, это же варварство! И государству разорение. Выходит, пусть добро пропадает, только бы подешевле не пустить... Поражаюсь позиции Министерства здравоохранения. Это ж надо объявить 2008 год Годом здоровья! Видимо, имеется в виду здоровье для тех, кто и так пользуется всеми благами, льготами, имеет весьма приличные оклады и пенсии.

Вспоминаю, как 10 лет назад мне довелось побывать в Германии. Больше всего понравились тамошние старички и старушки. Все аккуратненькие, ухоженные. У всех завидная, по возрасту обувь: кожаная, мягкая, удобная (у нас купи такую!). Посетила общину (небольшую деревушку), где был центр оздоровления наших детей. Стояла ранняя весна, дети еще не приезжали, но хозяева уже заранее готовились к их встрече. Деньги, на которые они содержали и оздоравливали наших детей, сельчане зарабатывали. Делали украшения к Пасхе, пекли пироги и были очень рады, что могли все это продать и три тысячи марок пустить на нужды центра. Члены общины заинтересованно обсуждали в деталях, как они примут белорусских детей, какие сюрпризы и подарки для них приготовят. Обсуждение проходило в общественном доме, где есть две кухни с полным набором посуды для проведения свадебных застолий и других торжеств, танцевальный зал и многое другое.

Но больше всего меня поразил один стенд — с фотографиями пожилых людей. Мне объяснили: этим людям община помогает во всем, и о них должны знать все. Видела, как на маленьком автомобиле приезжают старички и старушки, у которых уже голова трясется, но они за рулем. Приезжают в оздоровительный центр. Там к их услугам — открытый и закрытый бассейны, врачи, зимний сад и кафе, где они подолгу сидят, беседуют, радуются жизни. Да и на улицах за столиками увидишь немало пожилых людей, которые никуда не торопятся.

И это все — нормально. Ведь известно, что ценность государства определяется тем, как в нем живут отцы и деды. Увы, если наша власть не изменит отношения к своему народу, и прежде всего старшему поколению, никакой "макияж" в улучшении внешнего имиджа не поможет.

С уважением —

А.ЖУКОВСКАЯ,
минчанка.

Як Мірон пісаў агульнанацыянальную дыктоўку

Па-першае, зрабіць гэта ён вырашыў 14 мая. Чаму менавіта ў гэты дзень? Таму, што 14 мая 1995 года, як вядома, быў праведзены рэферэндум, вынікі якога дэмакратычная грамадскасць лічыць сумніўнымі. Мірон не можа пагадзіцца з тым, што ўлады загналі беларускую мову ў рэзервацыю. У афіцыйнай сферы грамадскага жыцця фактычна выкарыстоўваецца адна мова — руская, якая з'яўляецца чужой, а не роднай для беларускага народа.

Любая акцыя Мірона вызначаецца арыгінальнасцю. Хто мог падумаць, што дыктоўку па беларускай мове ён будзе пісаць на даху 16-павярховага жылога дома ў Віцебску, на скрыжаванні Маскоўскага праспекта, вуліцы Леніна і праспекта Чарняхоўскага. Пасля гэтага Мірон вывесіў над будынкам у цэнтры горада бел-чырвона-белы сцяг, прымацаваўшы да яго цыдульку з надпісам: **"Беларуская мова жыла, жыве і будзе жыць вечна, як і нацыянальныя сімвалы — бел-чырвона-белы сцяг і герб "Пагоня". Жыве Беларусь! Мірон".**

Мясцовы апазіцыянер Барыс Хамайда нагадаў, што якраз 13 год таму адбылася самая першая акцыя легендарнага Мірона: ён узняў бел-чырвона-белы сцяг на коміне кацельнай у райцэнтры Лёзна ў знак пратэсту супраць афіцыйных вынікаў рэферэндуму 1995 года, пасля якога дзяржаўным сцягам Рэспублікі Беларусь стаўся сучасны чырвона-зялёны, а бел-чырвона-белы сцяг быў абвешчаны "незарэгістраванай сімволікай".

Сцяпан КЕЗ.

ВАС ЦІКАВІЦЬ...

Знаёмцеся: Джонатан Мур

Падчас сапраўднай халоднай вайны паміж Беларуссю і ЗША, якую мы зараз назіраем, прадстаўніком афіцыйнага Вашынгтона ў Мінску застаўся малады прыгожы чалавек Джонатан Мур. Беларускія СМІ ніколі пра яго не пісалі, але, як можна здагадацца, ён не з шараговых дыпламатаў. Ці не магла б "Народная воля" расказаць пра яго?

Ілля Віктаровіч, г.Гомель.

Джонатан Мур прыбыў у Беларусь 25 ліпеня 2006 года ў якасці намесніка кіраўніка місіі ў амбасадзе ЗША ў Беларусі.

Спадар Мур пачаў дыпламатычную працу ў 1990 годзе. Яго першым месцам прызначэння была амбасада ЗША ў Бялградзе. З 1993-га па 1995 год ён працаваў у аддзеле па справах былой Югаславіі Дзярждэпартамента ЗША, а з 1995-га па 1999 год з'яўляўся кіраўніком палітыка-эканамічнага аддзела амбасады ЗША ў Вільнюсе. Пасля працы на працягу года ў офісе па палітычных пытаннях спікера Палаты прадстаўнікоў Кангрэса ЗША Дэніса Хастэрта Джонатан Мур з 2000-га па 2002 год займаў пасаду намесніка дырэктара ўпраўлення Дзярждэпартамента ЗША па справах Расіі. На пачатку 2002 года ён таксама некалькі месяцаў выконваў абавязкі дырэктара гэтага ўпраўлення. З 2002-га па 2005 год Джонатан Мур з'яўляўся намеснікам амбасадара ЗША ў Віндхуку (Намібія), а перад прыездам у Мінск ён працаваў навуковым супрацоўнікам па пытаннях нацыянальнай бяспекі ў інстытуце Гувера пры Стэнфардскім універсітэце.

Джонатан Мур і яго жонка маюць дзвюх дачок.

Спадар Мур валодае шэрагам ганаровых узнагарод Дзярждэпартамента ЗША, а таксама дзвюма ўзнагародамі Амерыканскай дыпламатычнай асацыяцыі за прафесійнае валоданне мовамі. Як мы высветлілі, амерыканскі дыпламат валодае сербскай і літоўскай мовамі, а таксама размаўляе на рускай, нямецкай і дацкай мовах.

Дарэчы, прэзідэнт Літвы ўзнагародзіў яго Рыцарскім крыжам ордэна Вялікага князя Гедыміна.

ПАЗІЦЫЯ

І ў чым вы, Вячаслаў Францавіч, бачыце бээнэфаўскі «душок»?

Прачытала ўрыўкі з успамінаў Вячаслава Кебіча і не магу ўтрымацца, каб не напісаць у любімую газету. У мяне ёсць некалькі пытанняў да аўтара кнігі.

Ён піша, што яго не падтрымалі газеты, "мочили", па яго словах, калі ён ішоў на прэзідэнцкія выбары 1994 года. Асабліва адмоўна ставіцца экспрэм'ер і экс-кандыдат у прэзідэнты да тагачаснай "Народнай газеты", дзе тады галоўным рэдактарам быў Іосіф Паўлавіч Сярэдзіч. Маўляў, яна "тогда была с БНФ-ским душком". А што гэта такое, той "бээнэфаўскі душок"? Як рука магла такое напісаць? Склалася ўражанне, што тав.Кебіч тады толькі нарадзіўся на Божы свет і не быў сведкам тых падзей, калі Беларускі Народны Фронт на чале з Зянонам Пазьняком абуджаў у нас імкненне "людзьмі звацца". Гэта, Вячаслаў Францавіч, па-вашаму, — бээнэфаўскі душок?!

А можа, гэты "душок" — калі З.Пазьняк і яго таварышы, а таксама лепшыя нашы інтэлігенты — навукоўцы, пісьменнікі — адкрывалі ўсяму свету праўду, што менавіта Беларусь больш за ўсіх пацярпела ад чарнобыльскай навалы? Беларускім Народным Фронтам і навукоўцамі тады была распрацавана і прадстаўлена прынятая парламентам грунтоўная праграма пераадолення наступстваў страшнай бяды. Але тымі, хто стаяў тады і сёння ля дзяржаўнага стырна, яна была адкінута і закінута...

Вы, тав.Кебіч, так хваліце свайго былога апанента і саперніка — пераможцу на выбарах 1994 года, што мы вас проста не разумеем.

Вы, Вячаслаў Францавіч пішаце: "Но зададимся крамольным вопросом: победи сегодня оппозиция, куда повернет страна?" Пішаце са страхам і жахам. Не буду гаварыць за ўсю апазіцыю — яна розная. А вось каб кіраўніком у Беларусі быў Зянон Станіслававіч Пазьняк, то, веру, мы б былі ўжо квітнеючай дзяржавай еўрапейскага кшталту, і людзі, стаўшы гаспадарамі свайго лёсу, жылі б не гэтак, як зараз. Любіць Радзіму трэба так, як любіць яе адданы сын Беларусі Зянон Пазьняк, і ўсё тады зменіцца да лепшага.

Ужо 20 год таму ён са сваімі паплечнікамі-аднадумцамі здолелі даказаць, насуперак хлуслівым выдумкам, што ў Курапатах няма іншага расстрэльнага следу, як толькі — савецка-камуністычны. І тое абвергнуць ніхто не можа, як бы ні пнуўся. Дык што, гэта таксама "бээнэфаўскі душок"? Ці, можа, вы здолееце абвергнуць тысячу разоў даказанае нейкімі важкімі, аргументанымі фактамі?

Вы так шкадуеце, што распалася гэтая сістэма — Савецкі Саюз, які ўвесь час ваяваў са сваім народам і не толькі. Расійскі ваенны гісторык Д.Валкагонаў даказаў, што бальшавіцкая ўлада знішчыла больш чалавечых жыццяў, чым страшная гітлераўская навала. Дык навошта шкадаваць аб тым, што, дзякуй Богу, само развалілася?

Памятаю, як цяжка, вельмі цяжка было працаваць у Вярхоўным Савеце 12-га склікання (гэта мы ўсё чулі па радыё і глядзелі па тэлебачанні) невялікай купцы дэпутатаў з апазіцыі БНФ. Але як яны змагаліся! Дзякуючы іх розуму, адданасці, мэтанакіраванасці і энергіі ўдалося на той час вярнуць нам дарагія сэрцу гістарычныя нацыянальныя сімвалы: бел-чырвона-белы сцяг, герб "Пагоня" і родную беларускую мову. Гэта было свята душы! Не забыць, як многія тады ўстрапянуліся, пацягнуліся сэрцам да дарагога — даўно, здавалася б, страчанага. Бо толькі родная мова можа ператварыць насельніцтва ў народ, раскрыць яго стваральную сілу, што і відавочна сёння на прыкладзе нашай суседкі Украіны, хаця ў яе палітыкі нямала нядобразычліўцаў.

А ці можаце аспрэчыць такое: гэта ж калі вы былі прэм'ерам, то ў Беларусі ўвялі талоны амаль на ўсё, і мы гадзінамі стаялі ў чэргах, каб іх атаварыць, хоць што-небудзь знайсці ў краме. Сорамна было і за нас, і за вашу палітыку. Сённяшні ж кіраўнік дзяржавы чамусьці ўпарта абазначае той час такім чынам: "когда при власти были националисты". Насамрэч жа ўсе ніці кіравання — эканамічныя, арганізацыйныя і іншыя былі ў вашых руках, Вячаслаў Францавіч. Ці гэта не так? Навошта ж звальваць усё з хворай галавы на здаровую?

У той цяжкі час дэпутаты-апазіцыянеры разам з лепшымі вучонымі-эканамістамі дабіліся прыняцця ў Вярхоўным Савеце ўвядзення нацыянальнай валюты, і гэта дазволіла хоць неяк утрымаць сітуацыю (канешне, шкада, што тое быў беларускі рубель, а не талер).

Сучаснасць нашай краіны была б зусім іншай, калі б тыя, хто тады трымаў рэальную ўладу ў руках, свядома і актыўна абапіраўся на сапраўды патрыятычныя сілы, увасабленнем якіх быў і застаецца дагэтуль найадданейшы сын Бацькаўшчыны, яе празорца, нязломны змагар за адраджэнне Беларусі Зянон Станіслававіч Пазьняк. Нізкі яму паклон, пашана і сардэчная любоў, пажаданне невычэрпных сіл у высакародных справах дзеля светлай будучыні Айчыны!

Валянціна САКАЛОВА,
настаўніца-пенсіянерка.

Гомель.

Народная Воля http://www.nv-online.info
28 МАЯ 2008 г.

События в мире: европейский взгляд

Почему в Казахстан и Китай?

Первая зарубежная поездка нового президента России. На пути в Китай Дмитрий Медведев остановился в Казахстане.

При встрече Медведев и Назарбаев обменялись комплиментами. Нурсултан Назарбаев, как старший и как хозяин встречи, заявил, что "это великая честь — принимать с первым зарубежным визитом Дмитрия Медведева именно в Казахстане".

